Грамадска-палітычная газета Іванаўскага раёна

# Чырвоная Звязда

Выдаецца з 1943 г.

кошт у розніцу 250 рублёў

4 студзеня 2011 аўторак № 1 (8581)

## На вышэйшым узроўні

**Бізнесмены павінны не чакаць Дырэктывы па лібералізацыі эканомікі, а пачынаць працаваць. Аб гэтым заявіў 30 снежня журналістам Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, адказваючы на пытанне, калі будзе прынята Дырэктыва нумар 4 па лібералізацыі эканамічных адносін.**

Журналістамі было адзначана, што за беларускай праграмай рыначных рэформ пільна сочыць бізнес як унутры краіны, так і замежныя інвестары. У сувязі з гэтым з Аляксандра Лукашэнкі пацікавіліся, калі будзе прынята адпаведная дырэктыва, і ці будзе яна канчатковай праграмай дзеянняў.

«Калі б у нас наогул не было бізнесу, то гэта пытанне дарэчы. Дырэктыва павінна даць дадатковы штуршок да развіцця прадпрымальніцтва і прадпрымальніцкай ініцыятывы ў краіне, - сказаў кіраўнік дзяржавы. - А там, дзе вузкія месцы, яна павінна «расшырыць» іх. Што датычыцца чаканняў бізнесменаў, - чакаць не трэба, трэба ісці і працаваць».

❑

**Пажылыя людзі ў Беларусі атрымаюць магчымасць пажыццёвага абслугоўвання ў абмен на нерухомую маёмасць. Даручэнне аб неабходнасці развіцця ў Беларусі рэнтных паслуг даў кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка, наведваючы дом-інтэрнат для ветэранаў вайны і працы «Світанак».**

Як далажыў кіраўніку дзяржавы старшыня Мінгарвыканкама Мікалай Ладуцька, сумесна з Мінпрацы і сацабароны падрыхтаваны і ўнесены ва ўрад дакумент аб развіцці двух відаў рэнтных паслуг, якія з'яўляюцца новымі для Беларусі, але ўжо даўно рэалізаваны і паспяхова працуюць у некаторых краінах Еўропы. Сутнасць першага віду такіх паслуг у тым, што, напрыклад, пажылы адзінокі чалавек заключае дагавор з сацыяльным органам, у адпаведнасці з якім яго кватэра пераходзіць у камунальную ўласнасць. У сваю чаргу такі чалавек атрымлівае права пажыццёвага абслугоўвання: яму будуць набывацца прадукты харчавання, за яго будуць выплачвацца камунальныя плацяжы і гэтак далей. Такому чалавеку таксама будзе пажыццёва выплачвацца невялікая рэнта, а пасля смерці кватэра будзе прададзена або перададзена каму-небудзь у адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам.

*БЕЛТА.*

☑ С новосельем!



# Новый год – в новых апартаментах

**24 декабря в Иванове состоялось торжественное открытие нового здания районного отделения Департамента охраны. В церемонии приняли участие руководитель республиканской службы полковник милиции Сергей Буйновский, начальник финансово-экономического управления Департамента Игорь Кирпиченко, начальник управления тыла подполковник Виктор Севашко, начальник Брестского областного управления подполковник Олег Самосюк, председатель Ивановского райисполкома Юрий Бисун, начальник подрядной организации СПМК-7, которая проводила реконструкцию здания, Василий Бабич, а также личный состав Ивановского отделения.**

Вопрос о новом здании витал в тесных кабинетах охраны уже давно. Ведь в здании райотдела милиции в одном кабинете ютились по три-четыре сотрудника. О каком полноценном приеме граждан можно было говорить? И вот в конце 2009 года руководство Департамента охраны приняло окончательное решение – перестроить видавшее виды бывшее административное здание автопарка, придать ему современный вид, чтобы местные охранники могли полноценно трудиться. К концу минувшего года это здание превратилось в обновленное не только снаружи, но и внутри новое место дислокации столь необходимой для района службы. Начальник Ивановского отделения Департамента майор милиции Сергей Малич подчеркнул, что в течение реконструкции было освоено более полутора миллиардов рублей. Огромные средства потрачены не впустую. Перепланировке подверглось все – от крыши до подвала, перекроены перегородки кабинетов, окна, выполнена внутренняя отделка, благоустроена прилегающая к зданию территория. Остались нетронутыми лишь стены да основные несущие конструкции.

Символический ключ от здания Василий Бабич, начальник Ивановской СПМК-7, вручил начальнику отделения Сергею Маличу под аплодисменты приглашенных. Затем председатель райисполкома Юрий Юрьевич Бисун вместе с С.А.Буйновским и С.С.Маличем перерезали алую ленту. Всех присутствующих на церемонии освятил и благословил на добрые дела отец Владимир, клирик Свято-Покровского храма г. Иванова.

Руководитель района и начальник управления осмотрели помещения нового здания, ознакомились с условиями, в которых предстоит трудиться охранникам. Кстати, в новых кабинетах установлена современная компьютерная техника, удобная мебель, созданы все условия для того, чтобы ивановские «хранители спокойствия» с честью справлялись с решением своих задач. А это, прежде всего, охрана имущества и обеспечение безопасности граждан.

Естественно, лучшие члены трудового коллектива были отмечены наградами. Так, Василий Кунаховец, ст. лейтенант милиции, старший инспектор-инженер, и Дмитрий Цябук, прапорщик милиции, командир отделения группы задержания, приняли из рук руководства нагрудные знаки «За адзнаку», а Сергей Малич – Почетную грамоту Департамента охраны. Ирина Шиш, главный бухгалтер, отмечена Благодарностью. Звание младшего сержанта присвоено молодым специалистам А.В.Бородинчику и С.В.Михновцу, которые заступили на службу 18 декабря, сразу после получения дипломов Учебного центра Департамента охраны МВД Республики Беларусь.

Не обошлось, конечно же, и без подарков. Ведь вдобавок ко всему, в минувшем году, в декабре, служба отметила свой 25-летний юбилей.

*Мария ФЕДОРУК.*

## Сессия районного Совета депутатов

**Состоялась последняя в ушедшем году сессия районного Совета депутатов 26 созыва.**

На повестку дня было вынесено десять вопросов. Из них шесть касались изменений и дополнений в решения районного Совета №116 от 29.12.2009, №20 от 23.11.2010, №8 от 30.03.2007, №22 от 26.09.2007, №96 от 26.06.2009, №120 от 28.12.2009. По ним докладчиками выступили Н.А.Фисюк, начальник финансового отдела райисполкома и Н.Н.Шум, зам. председателя райисполкома.

Также были приняты решения по остальным вопросам: "Об освобождении от перечисления в районный бюджет арендной платы», «О принятии в коммунальную собственность Ивановского района акций ОАО «Ивановский райагросервис», «О порядке определения позиции представителя государства», «О плане работы районного Совета депутатов и его органов на 2011 год».

Обязательные к обнародованию решений будут опубликованы в ближайших номерах газеты.

## ФактНАУРА

### Адходы - у балы

8 снежня ў Брэсце адбыўся абласны этап конкурсу эколага-біялагічных работ навучэнцаў агульнаадукацыйных устаноў. У складзе каманды Іванаўскага раёна навукова-даследчую працу «Праблема цвёрдых бытавых адходаў, шляхі яе вырашэння» прадставіў вучань 11 класа Махроўскай школы Аляксандр Паўлюкавец. Пры падвядзенні вынікаў журы высока ацаніла прадстаўленую працу. Дыплом ІІ ступені і выхад у зборную вобласці – вынік выступлення Аляксандра. Цяпер ён разам са сваім кіраўніком В.Ф.Козелам, настаўнікам інфарматыкі, рыхтуецца прадставіць даследаванні ў аргкамітэт XXII рэспубліканскага конкурсу эколага-біялагічных работ, абарона якіх адбудзецца ў лютым 2011 года ў Мінску.

### Арыенцір – перамога

25-26 снежня ў Брэсце і Камянцы праводзіліся адкрытыя спаборніцтвы па спартыўным арыентаванні «Навагодняя гульня».

Гурткоўцы Іванаўскага цэнтра турызму і краязнаўства пад кіраўніцтвам Аляксандра Шурхая занялі тры першыя месцы і адно другое.

Сярод пераможцаў - Дар'я Клепач, Галіна Звягінцава, Дзіяна Баярчук, Уладзіслаў Божка. Усе яны ўзнагароджаны граматамі абласнога цэнтра дзіцяча-юнацкага турызму і каштоўнымі прызамі.

*Ул. КАР.*

### У лідарах – "Белсолад"

Завяршылася першынство раёна па валейболу сярод арганізацый, прадпрыемстваў і ўстаноў горада. Увогуле ў гэтым турніры прымалі ўдзел 14 каманд. Восем мацнейшых сустрэліся ў фінальных гульнях, якія праводзіліся па кругавой сістэме.

Абсалютным лідарам спаборніцтваў стала каманда адкрытага акцыянернага таварыства "Белсолад", якая набрала 12 ачкоў. Прычым, абышлася яна без прыгшрэнняў мацнейшых спартсменаў збоку.

На дзесяць ачкоў у фінале запісалі на свой рахунак валейбалісты раённага аддзела ўнутраных спраў і "Белаграпрамбанка". Аднак у папярэдніх матчах "сілавікі" перамаглі "банкіраў", таму другое і трэцяе месцы размеркаваліся адпаведным чынам.

### Так трымаць, Каця!

Завяршылася асабістае першынство Іванаўскага раёна па стральбе з пнеўматычнай вінтоўкі. Спаборніцтвы праходзілі ў спартыўнай зале гарадскога фізкультурна-спартыўнага клуба ў трох узроставых групах. У першай (1997 год нараджэння і малодшыя) перамогу атрымаў Ілля Кіўчун (гімназія), на другім месцы – Міша Наумавец (СШ №4), на трэцім – Арцём Шурхай (СШ №3).

У другой узроставай групе (1995-96 гады нараджэння) лідзіраваў Арцём Жушма (гімназія), а следам за ім – Дзіма Лось (СШ №3) і Аляксей Дзяменчык з гэтай жа школы.

Трэцюю групу (1994 года нараджэння і старэйшыя) не падвёў Дзяніс Цёмны (СШ №3), а таксама яго аднагодкі Коля Дудка (ДУА "Іванаўскі раённы цэнтр дзіцяча-юнацкага турызму і краязнаўства") і Вадзік Трушко (гарадская школа №2), якія заваявалі адпаведна другое і трэцяе месцы.

Усепераможцы і прызёры ўзнагароджаны Дыпломамі і каштоўнымі падарункамі. Але асабліва хацелася б адзначыць адну з нямногіх дзяўчын, якая асмелілася памерацца сіламі і трапнасцю з хлопчыкамі-равеснікамі. Гэта Каця Федарук (СШ №4). Яна, дарэчы, узнагароджана спецыяльнай граматай арганізатараў спаборніцтваў "За волю да перамогі".

*Сяргей ПАШКЕВІЧ, дырэктар Іванаўскага фізкультурна-спартыўнага клуба.*

# Што новага ў краіне

**Савет Міністраў Беларусі пастановай нумар 1885 ад 24 снежня 2010 года зацвердзіў палажэнне аб правядзенні рэспубліканскага конкурсу «Нацыянальная музычная прэмія ў галіне эстраднага мастацтва». Аб гэтым паведаміла прэс-сакратар Міністэрства культуры Ганна Смольская.**

Конкурс праводзіцца ў мэтах развіцця нацыянальнага музычнага мастацтва і стварэння ўмоў для папулярызацыі творчасці беларускіх эстрадных выканаўцаў, павышэння прэстыжу айчынных аўтараў, выканаўцаў.

Конкурс на Нацыянальную музычную прэмію праводзіцца ў тры этапы і вызначае па аднаму пераможцу ў наступных намінацыях: «Лепшая песня года», «Лепшы выканаўца», «Лепшы калектыў выканаўцаў», «Адкрыццё года», «Лепшы кампазітар», «Лепшы паэт-песеннік», «Лепшы прадзюсар», «За ўклад у развіццё беларускай эстрады».

Для ўдзелу ў конкурсе прадстаўляюцца творчыя праекты, рэалізаваныя ў галіне эстраднага мастацтва. На першым этапе ў сродках масавай інфармацыі публікуецца анонс конкурсу і фарміруецца адборачная камісія, якая, вывучыўшы творчыя праекты, назаве прэтэндэнтаў на перамогу ў намінацыях, абазначаных для інтэрактыўнага галасавання. Падтрымаць любімага выканаўцу можна будзе на інтэрнэт-сайтах FM-станцый.

Спіс музыкантаў, вызначаных для ўдзелу ў другім этапе конкурсу, будзе размешчаны ў СМІ і на сайтах арганізатараў. На другім этапе фарміруецца экспертны савет з ліку дзеячаў культуры і мастацтва, прадстаўнікоў электронных і друкаваных СМІ, ствараюцца інфармацыйна-рэкламныя ролікі канкурсантаў. Экспертны савет разглядае творчыя праекты. Прадаўжаецца галасаванне гледачоў.

Заключны этап - гала-канцэрт з удзелам канкурсантаў, якія выйшлі ў другі этап, у час якога абвяшчаюцца імёны пераможцаў (яны вызначаюцца шляхам ацэнкі экспертнага савета і інтэрактыўнага галасавання). Пераможца атрымлівае прыз-сімвал конкурсу, дыплом лаўрэата і грашовую прэмію. Пераможцу ў намінацыі «Лепшая песня года» дадаткова ўручаецца сертыфікат на стварэнне музычнага кліпа.

Праект плануецца рэалізаваць у студзені-снежні 2011 года. Арганізатарамі нацыянальнай музычнай прэміі выступілі Міністэрства культуры Беларусі і ЗАТ «Сталічнае тэлебачанне».

***БЕЛТА*.**



*Завтра – День работников социальной защиты*

# Спасающие от одиночества

**В тот день Мохровский Дом культуры стал центром особого притяжения. Здесь состоялся районный конкурс профессионального мастерства среди социальных работников. Открывая его, ведущая очень точно сформулировала сущность данной профессии: «…Это скорее призвание. Ведь, посудите сами, такой Божий дар, как умение разделить боль, печаль, нужду, прийти на помощь любому человеку, дарован далеко не каждому. А наши социальные работники не столько по долгу службы, а в первую очередь по зову сердца всегда там, где их ждут, где в них нуждаются… Они – связующее звено между одиноким пожилым человеком и окружающим миром. Для своего подопечного это помощник и заступник, доктор и учитель, психолог и юрист. А в первую очередь – настоящий друг, который всегда поймет, простит, придет на помощь…»**

Именно эти качества и нужно было проявить участникам конкурса. А в том, что они ими обладают, зрителям, членам жюри можно было убедиться еще до начала мероприятия. В фойе Дома культуры социальные работники Мохровского (Валентина Епишко и Елена Грушевская), Крытышинского (Мария Сацута и Наталья Гурская), Одрижинского (Тамара Юшкевич и Лидия Бриль) и Снитовского (Мария Медведюк и Светлана Богомаз) сельсоветов развернули выставку, на которой представили мастерски выполненные образцы кулинарного искусства. Здесь мы увидели нечто необыкновенное: умелые руки этих женщин на глазах превращали обычные продукты в фантастические блюда. Дальнейшие конкурсы засвидетельствуют, что все участницы являются настоящими мастерами своего дела.

В первом, например, представляя свою профессию, они показали даже видеофильмы и слайды, наглядно демонстрирующие бесконечные хлопоты по оказанию помощи одиноким и престарелым жителям своих деревень. Их же у сельчан всегда хватает, а справиться немощным людям с житейскими проблемами далеко не всегда под силу.

Во втором туре потребовалось проявить даже специальные знания нормативно-правового обеспечения социальной защиты населения, социальных технологий работы с гражданами пожилого возраста и инвалидами.

Название очередного тура – «Домашний доктор» - без дополнительных объяснений говорило об испытаниях, которые ждали конкурсанток. В теоретической его части нужно было ответить на вопросы, заданные в выбранном по жеребьевке билете, в практической – правильно измерить кровяное давление у приглашенных из зала зрителей.

Заключительный этап этого профессионального соревнования – «Музыкально-поэтический». Он также поразил и зрителей, и жюри. Оказывается, наши социальные работники – не только настоящие труженицы, но и поэты, и музыканты, и даже… артисты. Стихи, песни собственного сочинения они исполняли просто восхитительно. Особенно поразила сценка в исполнении хозяек конкурсной площадки Валентины Епишко и Елены Грушевской. За предыдущий вечер, практически без репетиций, они смогли сочинить частушки, другую литературную часть мини-спектакля на мотивы своей профессии. Юмор был оригинален; женщины заставили всех присутствующих смеяться от души.

Порадовали участников этого предновогоднего праздника исполнением популярных песен вокальная группа народного ансамбля Мохровского сельского Дома культуры, учащиеся хореографической школы. А все песни дуэта мохровских школьниц в составе Кристины Климовец и Алины Павлюковец принимались на «бис».



Жюри, в состав которого входили не только руководители районной социальной службы во главе с начальником управления по труду, занятости и социальной защите райисполкома Жанной Яковлевной Парфеевец, представители сельисполкомов, честь которых защищали конкурсантки, но и главный врач Мохровской врачебной амбулатории Владимир Александрович Святощик (именно он мог профессионально определить правильность медицинской помощи опекуемым людям), скупиться на оценки не стало. Все женщины награждены ценными подарками и дипломами.

***Василий ЖУШМА.***

**НА СНИМКАХ: моменты конкурса профессионального мастерства социальных работников.**

***Фото автора.***

*В тему*

## Соцработник спешит на помощь

35 лет отработала дояркой в родном колхозе «40 лет Октября» Елена Алексеевна Пташиц. Вырастила четверых сыновей. Трое разъехались по городам, а четвертый, инвалид с детства, остался жить с матерью. Что и говорить, нелегко пожилой женщине ухаживать за больным человеком. Но помощь ей предложила социальный работник Валентина Владимировна Гацко. Женщина не отказалась и все эти четыре года, что ухаживает за ней соцработник, радуется такой услуге.

- Может быть, я не по тому номеру телефона звонила о замене электросчетчика, но долго не могла решить свой вопрос. А вот стоило Валечке один раз обратиться в службу - на второй день заменили, - с радостью рассказывает Елена Алексеевна. - Чтобы я делала без нее?..

- Все наши подопечные - люди пожилые, со своими характерами и болезнями, - рассказывает Валентина Владимировна. - Они нуждаются в уходе, в помощи по дому и даже совете. За четыре года я так подружилась с ними, что кажется, будто породнилась. Это подтверждают и другие социальные работники.

***Алла КОТКОВЕЦ.***



# Радость – от внимания, польза – от подарков

*Милосердие*

Вот и наступила пора новогодних и рождественских праздников, когда все с нетерпением ждут подарков и чудес, когда лесная красавица в сверкающей мишуре и игрушках, переливаясь всеми цветами радуги, отражается в счастливых детских глазах. А взмыленные взрослые бегают в поисках кукол, машин и прочих игрушек по универмагам и «детским мирам».

Не оказались в стороне от праздничных торжеств и дети-инвалиды. Накануне Нового года Ивановский районный центр коррекционно-развивающего обучения и реабилитации провел акцию «Подарим наши сердца больным детям». В ее ходе 16 семей, воспитывающих детей-инвалидов, получили новогодние сюрпризы. Собрать их помогли спонсоры - СПК «Агро-Мотоль», «Достоево», «Ополь-Агро» и УКСП «Совхоз имени И.А.Поливко». А для того, чтобы от подарков их обладатели получили максимальную пользу, наборы собирались в соответствии с результатами опроса среди нуждающихся семей и обследования жилищно-бытовых и материальных условий. С теплой улыбкой и веселыми поздравлениями социальный педагог Лариса Воронович и педагог-психолог Юлия Зубач вручали детям игрушки, альбомы, краски и другие канцелярские принадлежности, а также продуктовые наборы и подгузники.

Огромную благодарность коллектив ГУО «Ивановский районный центр коррекционно-развивающего обучения и реабилитации» высказывает председателям выше названных хозяйств В.Н.Каштальяну, П.Н.Мельнику, В.А.Столбунову и А.С.Маличу.

**НА СНИМКЕ: Л.И.Воронович и Ю.А.Зубач вручают подарки Александру Кунаховцу и его маме Татьяне Федоровне.**

***Текст и фото Валерия МИХАЛЬЧУКА.***

2 студзеня – Дзень банкаўскіх і фінансавых работнікаў



# Надзея фінансавай установы

**Ёсць нешта сімвалічнае ў тым, што першымі ў Новым годзе свае прафесійнае свята адзначаюць банкаўскія і фінансавыя работнікі. З гэтай нагоды мы пабывалі ў разлікова-касавым цэнтры №1 г. Іванава Палескага аддзялення ААТ "Белаграпрамбанк" г. Пінска.**

Як нас, так, дарэчы, і кожнага завітаўшага наведвальніка першай сустракае кансультант цэнтра Надзея Пятроўна Кухарчук. Ветлівая, светлавалосая, статная дзяўчына. І хоць працуе яна тут усяго каля двух гадоў, за гэты кароткі час заслужыла аўтарытэт і павагу калег і кіраўніцтва. Аб яе крэатыўнасці, эрудыраванасці, уменні кантактаваць з кліентамі хораша гаварылі начальнік цэнтра Ігар Рыгоравіч Керазь і яго намеснік Таццяна Васільеўна Жук. Яны ж парэкамендавалі напісаць пра Надзею ў газету.

Субяседніца аказалася надзвычай шчодрай на пахвалу. Выказала нямала добрых слоў у адрас начальніка аддзела рознічных паслуг Іны Дзядзюк, Таццяны Мазько, Ірыны Устымчук, Аляксандра Кулічкова, Ігара Кавальчука, Ксеніі Гулюк, Валерыя Новіка і многіх іншых калег за падтрымку ў авалодванні практычнымі навыкамі банкаўскай справы. Дзякуючы калегам, зараз яна адчувае сябе ўпэўнена, без замінак можа аператыўна выканаць любую просьбу кліента.

Па словах дзяўчыны, яна адчувае сябе на сваім месцы, хаця напачатку марыла быць настаўніцай – скончыла Брэсцкі педуніверсітэт, а затым атрымала другую вышэйшую адукацыю. У вольны час яна любіць чытаць, аддае перавагу Рэмарку і Караткевічу. Працоўны калектыў, а гэта больш за паўсотню чалавек, стаў для яе другой сям'ёй. Тут яна ва ўсім адчувае паразуменне і падтрымку.

Мабыць, цяжка адшукаць такога чалавека, які хоць раз у жыцці не звяртаўся б да паслуг банкаўскіх ці фінансавых работнікаў. Таму ад імя чытачоў раённай газеты з задавальненнем віншуем усіх іх з прафесійным святам, жадаем, каб новы 2011 год стаў годам здзяйснення самых запаветных мар і надзей.

***Надзея КУХАРЧУК.***

**НА ЗДЫМКУ: кансультант РКЦ №1 г. Іванава Палескага аддзялення ААТ "Белаграпрамбанк" Н. П. КУХАРЧУК.**

***Фота Валерыя МІХАЛЬЧУКА.***

Инспекция МНС информирует

# Если вы платите единый налог...

На налоговом учете в инспекции по Ивановскому району состоит 753 индивидуальных предпринимателя, в том числе 525 плательщиков единого налога.

Для тех из них, кто осуществляет розничную торговлю отечественными товарами, а также деятельность в сфере оказания потребителям услуг, снижена налоговая нагрузка в результате изменения порядка расчета доплаты по единому налогу. Во-первых, критерий выручки, при превышении которого исчисляется доплата налога, увеличивается с 20-кратного до 30-кратного размера единого налога, уплаченного за календарный месяц. Во-вторых, 30-кратный размер единого налога будет определяться без учета льготы по налогу и повышающего коэффициента «2» по иностранным товарам. В-третьих, налоговая ставка с суммы превышения выручки снижается с 10 до 8 процентов.

Перечень видов деятельности, при осуществлении которых не требуется регистрация физических лиц в качестве индивидуальных предпринимателей, дополнен еще 14-ю: уход за взрослыми и детьми; стирка и глаженье постельного белья и других вещей; выгул домашних животных и уход за ними; закупка продуктов, приготовление пищи, мытье посуды; внесение платы из средств обслуживаемого лица за пользование жилым помещением и коммунальные услуги; музыкальное обслуживание свадеб, юбилеев и прочих торжественных мероприятий; деятельность независимых актеров, конферансье, музыкантов; предоставление услуг тамадой; фотосъемка, изготовление фотографий; реализация котят и щенков при условии содержания домашнего животного (кошки, собаки); услуги по содержанию, уходу и дрессировке домашних животных, кроме сельскохозяйственных животных; предоставление секретарских услуг и услуг по переводу; предоставление услуг, оказываемых при помощи автоматов для измерения веса, роста; ремонт и переделка трикотажных, меховых, швейных изделий и головных уборов.

Установлен перечень сельскохозяйственной продукции, выращенной физическими лицами в личном подсобном хозяйстве, при розничной торговле которой уплата единого налога не производится. Это овощи и фрукты (в том числе в переработанном виде путем соления, квашения, мочения, сушения), иная продукция растениеводства (за исключением декоративных растений и продукции цветоводства), молочные и кисломолочные продукты (в том числе в переработанном виде), продукция пчеловодства, иная продукция животноводства (кроме пушнины) как в живом виде, так и продукты убоя в сыром или переработанном виде. Подтверждением того, что такая продукция произведена на земельном участке, предоставленном для строительства и обслуживания жилого дома и ведения личного подсобного хозяйства, будет являться справка, выдаваемая местным исполнительным и распорядительным органом (для продукции пчеловодства - ветеринарно-санитарный паспорт пасеки, выданный на территории Республики Беларусь, и (или) свидетельство, оформленное на основании этого паспорта).

Как и ранее, индивидуальные предприниматели, осуществляющие розничную торговлю, при наличии документов на все реализуемые товары вправе с начала отчетного периода (месяца) не применять систему уплаты единого налога, а применять общеустановленный порядок налогообложения либо вправе перейти на упрощенную систему налогообложения с соблюдением условий перехода.

К сведению: если индивидуальный предприниматель, перешедший с системы уплаты единого налога на иные режимы налогообложения, планирует осуществлять реализацию товара, на который полностью либо частично отсутствуют документы, то уже с первого дня нового 2011 года он обязан с начала отчетного периода (месяца), в котором будут реализовываться такие товары, перейти на режим уплаты единого налога и применять данный режим до окончания налогового периода (календарного года).

Дополнительная информация по телефонам: **2-23-62, 2-21-32.** ***Н.ТЯМЧИК, начальник отдела налогообложения физических лиц и индивидуальных предпринимателей.***

Амаль навагодні падарунак

# Дзякуй за аўталаўку

Паважаная рэдакцыя! Звяртаецца да вас стараста вёскі Псышчава па просьбе аднавяскоўцаў, якія пражываюць па вуліцы Чапаева ў аграгарадку Псышчава. Амаль усе мы на гэтай вуліцы – людзі пенсійнага ўзросту. Натуральна, сілы не тыя, што ў маладых. Нават да бліжэйшага магазіна ў сваім жа населеным пункце цяжка дабрацца.

Справа ў тым, што некалі дзесяткаў год таму вуліца, на якой мы пражываем, была самастойнай вёскай Закалле. Пасля далучэння да цэнтральнай сядзібы гаспадаркі яе насельнікі хоць і сталі жыхарамі Псышчава, ды магазін ад гэтага да нас не наблізіўся. Раней, як былі маладзейшымі, два кіламетры дзеля таго, каб купіць прадукты, пераадольвалі лёгка. Цяпер гэтая адлегласць шмат каму з нас не пад сілу. Асабліва ў асенне-зімовы перыяд. Каб вы ведалі: самаму малодшаму з 73-х жыхароў былога Закалля – 62 гады. А сярэдні ўзрост – каля 80-ці год.

Але мы не скаргу пішам, не. Наадварот, удзячнасць хочам выказаць. Справа ў тым, што прыкладна за месяц да Новага году нашу вуліцу пачала абслугоўваць два разы на тыдзень аўталаўка. Варта было нам звярнуцца да старшыні нашага сельвыканкама С.Р.Мельніка ды старшыні райпо Г.А.Расолава з адпаведнаю просьбаю, як яна ўжо і вырашылася. Дык дзякуй вялікі гэтым людзям за клопат пра нас, за аператыўнае і станоўчае рэагаванне на просьбу.

Удзячны мы таксама ж работнікам перасоўнай крамы Людміле Кароль ды вадзіцелю Юрыю Качуле за іх спагадлівыя адносіны да нас.

***Аляксандр КАЛАЦЭЙ, стараста аграгарадка Псышчава ад імя і па даручэнні жыхароў вул. Чапаева.***

Развагі пра важнае

Часам неапраўданае ўжыванне ў маўленні ненарматыўнай лексікі людзі тлумачаць пераўзбуджанасцю нервовай сістэмы. Маўляў, калі негатыўныя эмоцыі брыдкаслоўем выплеснуцца вонкі, наступае палёгка, душа ачышчаецца.

Дазвольце не пагадзіцца. Гнілое слова ў чалавечай душы, як ненажэрны чарвяк у яблыку. Калі нават чарвяк і пакіне плод, чарвяточына ў ім усё роўна застанецца.

А назаўтра чалавеку стане зразумела, што ў яго душы зноў скапіўся цяжар адмоўных перажыванняў. І зноў брудныя словы ляцяць у шырокі свет. І зноў ад іх у душы - чарвяточына. Так непрыкметна, але настойліва дрэнныя словы адваёўваюць, засмечваюць душу.

Дый невядома, якою бядой можа яшчэ абярнуцца злое слова, легкадумна выпушчанае ў наваколле, хто стане ахвярай яго знішчальнай энергетыкі?

# Давайце год пачнем без брыдкаслоўя

**"Напачатку было Слова. І Слова было ў Бога. І Слова было Бог", - радкі глыбокамудрага біблейскага выказвання ўслаўляюць яго вялікасць Слова, узносячы яго ў вышыню жывых Нябёсаў, надзяляючы боскай сутнасцю.**
**Слова - не хаэтычны набор пустазвонных гукаў, а невычэрпная ўмяшчальніца інфармацыі, якая дадзена ў карыстанне найвышэйшай зямной істоце - чалавеку. Слова валодае магутнай сілай і ў залежнасці ад волевыяўлення яго носьбіта можа мець стваральны і разбуральны пачаткі.**

Брыдкае слова ў людзей асацыіруецца з нечым цёмным, страшным, агідным.

Гэта даўно заўважылі нашы мудрыя прашчуры, адлюстраваўшы свой жыццёвы вопыт у жанрах вуснай народнай творчасці. Памятаеце, у жорсткай і сквапнай казачнай гераіні пры кожнай спробе вымавіць слова з рота, замест гукаў, выскоквалі слізкія жабы-рапухі.

Добрае ж слова, наадварот, - на вагу золата і ў асабістым жыцці чалавека, і ў яго прафесійнай дзейнасці.

У сям'і, дзе мужчына звяртаецца да каханай з пяшчотнай ласкавасцю, заўсёды на стале будуць свежапрыгатаваная вячэра, усе кашулі і майкі адпрасаваны.

У працоўнай сферы, дзе адносіны «начальнік-падначалены» грунтуюцца на прынцыпах жорсткасці і запалохванняў, ніколі не будзе такога поспеху, як там, дзе пануе атмасфера даверу, пахвалы, зычлівага шчырага слова.

Добрае слова ратуе, лечыць, акрыляе. Яно здольнае слабога зрабіць моцным, няшчаснага - шчаслівым, бязбожніка - веруючым.

♦♦♦

Слова можа ўпасці на душу і "прарасці" ў ёй, даўшы свой адмысловы плён.

Нядаўна ў тэлевізійным ток-шоу Андрэя Малахава "Пусть говорят" паказвалі гераічную каманду экіпажа самалёта, які здзейсніў аварыйную пасадку ў тайзе. Дзякуючы высокаму майстэрству лётчыкаў 72 пасажыры авіярэйсу шчасліва прызямліліся.

Калі камандзіра экіпажа, героя Расіі, спыталі, чаму ён стаў авіятарам, ён адказаў, што на ўсё жыццё запомніліся яму бабуліны словы: "Стань, унучак, лётчыкам, будзеш Чалавекам..."

Успамінаецца эпізод з майго дзяцінства: мы, вясковая басаногая дзятва, дурасліва бегаем па сакаўной маладзенькай руні, ускалыхваючы наваколле бестурботным залівістым смехам. Поле ад вёскі - рукой падаць, адразу за крайняй хатай. На лаўчцы пры плоце сядзіць стогадовая бабка Наталка, маршчын на яе ўчарнелым твары, відаць, столькі, колькі бабцы гадоў. Паклаўшы спрацаваныя рукі на драўляную кульбаку, бабка думае свае невясёлыя старэчыя думы. За свой век яна ўсяго перажыла, усяго перабачыла, і цяпер ужо нішто не можа здзівіць яе, вывесці з паўсоннай раўнавагі.Так падумае пра старую той, хто бачыць яе ўпершыню. А вось мы, дзетвара, добра ведалі бабку Наталку. Так хораша, як яна, ніхто не ўмеў расказваць жыццёвыя гісторыі. А бабуля ведала іх шмат. Мы так любілі слухаць бабчыны аповеды, што нас за вушы было не адцягнуць. Зачаравана пазіралі ў рот расказчыцы, нават не заўважаючы, як шамкаюць словы па яе бяззубых дзёснах.

Вось і тады, заўважыўшы старую Наталку, мы, не згаворваючыся, стрымгалоў кінуліся да яе.

Бабка не сварыла нас за тое, што топчам хлеб на карані, не ўшчувала. Але тое, што яна нам расказала, назаўжды адбіла ў нас усялякую ахвоту бегаць па жыце. "Даўным-даўно гэта было, яшчэ тады, калі я была такою, як вы цяпер,- зашалясцела сухімі вуснамі бабка. Стаіўшы дыханне, мы прыклеіліся вачыма да старой, прадчуваючы, што нешта незвычайнае чакае нас наперадзе, баючыся варухнуцца. Толькі чамусьці ніяк не атрымлівалася ўявіць парэпаную, як леташняя бульбіна, старую Наталку малой дзяўчынкай. А яна між тым працягвала. – Іду я аднойчы сцяжынкай, што віецца праз жытнёвае поле, а мне насустрач з самай гушчыні збажыны выходзіць маладзенькая прывабная дзяўчына ў вянку з васілёчкаў, што ўпрыгожвае яе распушчаныя, светлыя, да кален валасы. Зграбную дзявочую постаць хораша аблягае барвовы сарафанчык з залатым шырокім паясочкам. Незнаёмка смяецца і працягвае да мяне свае сіняватага колеру рукі з доўгімі-доўгімі пазногцямі... І пачынае казытаць, прыгаворваючы: "Заласкачу я цябе да смерці, будзеш ведаць тады, як жытам хадзіць, ператворышся ў такую ж палявую русалку, як і я." Спалохалася я неймаверна, і давай прасіць-маліць, каб адпусціла мяне. Насілу вырвалася ад яе жывой", - заканчвае аповед бабка Наталка, перайшоўшы на паўшэпт, нібы баючыся, што тая русалачка можа пачуць яе праз далеч гадоў.

Смешна, але нават і ў час сённяшні, калі выпадае ісці адной уздоўж высокай сцяны каласістай збажыны, заўсёды прыгадваецца бабка Наталка. І міжволі азірнуся па баках, каб упэўніцца, ці не выходзіць з густога жыта даўгакосая дзяўчына ў барвовым сарафанчыку.

♦♦♦

Між людзей кажуць, што вочы - люстэрка душы. Спрачацца не бяруся. Але я б яшчэ дадала, што, нібы ў люстраным шкельцы, душа знаходзіць свой адбітак у слове.

Па тым, якімі словамі карыстаецца чалавек, можна судзіць пра яго ўнутраную сутнасць, выявіць яго духоўнае аблічча.

У прывабнага разумнага чалавека - слова дасціпнае, мудрае. У бяздумнага пустабрэха - і слова пустое, як арэх без сарцавіны. Адно шкарлупінне.

У паганага, сквапнага чалавека - яно цёмнае, цяжкае, як камень, удушлівае.

Слова - своеасаблівы масток між светамі дабра і зла. Брыдкімі словамі вымашчана дарога ў Цемру, а прывабнымі - да Святла.

***Ірына СІНКЕВІЧ.***

# Сердечно поздравляем!



От всей души поздравляем дорогого мужа, отца и дедушку **Степана Павловича ЛЯЛЮКА** с 55-летним юбилеем!

***Поздравить рады с юбилеем. Здоровья, счастья пожелать, с улыбкой, добрым настроеньем свой путь по жизни продолжать. Живешь на свете ради близких, порою забывая о себе, и в этот день мы кланяемся низко за душу добрую тебе. До старости, глубокой и счастливой, ты доживи и правнуков дождись, и оставайся радостным и милым, какой бы трудной ни была бы жизнь.***

*Любящие жена, дети и внуки.*

❀❀❀

Поздравляем **Людмилу Васильевну ВЫБЕРАНЕЦ** с юбилеем!

***Пусть счастливые звезды Вам светят, пусть любовь согревает Ваш дом, мира, радости Вам, долголетия, и успехов огромных во всем!***

*Коллектив хора ветеранов войны и труда.*

❀❀❀

С нежностью и любовью от всей души поздравляем любимого мужа, отца и дедушку **Николая Николаевича КОЛОШУКА** с 55-летием!

***У тебя сегодня юбилей, и в день такого торжества прими от нас, родных тебе людей, простые, нежные слова. Мы желаем от чистого сердца радости в жизни, успехов везде, счастья побольше, здоровья покрепче и долгой, долгой жизни на земле.***

*Жена, сыновья, невестка, внуки.*

❀❀❀

От всей души поздравляем **Татьяну Николаевну КЛИМОВИЧ** с юбилеем!

***Желаем мира и согласья, уюта в доме и тепла, любви родных, детей и близких, достатка, счастья и добра. Пусть Ваше сердце не стареет, огонь в душе горит всегда! Удач, улыбок! И здоровье пусть не подводит никогда!***

*С уважением коллектив работников ГУО "Ясли-сад № 2 г. Иванова".*

❀❀❀

От всей души поздравляем нашу дорогую тетю и бабушку **Варвару Николаевну ВОЙТОВИЧ** с Днем рождения!

***Желаем много лет прожить, печали-горести не зная, пусть Ангел Вашу жизнь хранит и Бог во всем Вам помогает. А мы от всей души и сердца здоровья крепкого желаем.***

*Племянник Володя и вся его семья.*

❀❀❀

От всей души поздравляем мужа, папочку и дедушку **Тимофея Тимофеевича ШЕРЕМЕТА** с 60-летием!

***Промчалась вереница дней. Дней разных - горьких и счастливых. И вот настал твой юбилей, немного грустный и счастливый. И на душе твоей светло, неправда - сердце не устало, воды немного утекло, и в жизни сделано немало. Желаем много лет прожить, печали-горести не зная, пусть Ангел Вашу жизнь хранит, а Бог во всем пусть помогает.***

Крепкого здоровья!

*Жена, дети, внуки Денис и Саша.*

❀❀❀

От всей души поздравляем дорогую и любимую жену, мамочку, бабушку и прабабушку **Анну Логвиновну МАЛИЧ** с 70-летием!

***Мамочка, любимая, родная, твоей любовью свято дорожим. Ты нас ласкала, понимала, за все тебе спасибо говорим. Живи подольше, старости не зная, пусть будут сны спокойны и легки, тебя мы очень любим, дорогая, желаем счастья, радости, любви. Храни Господь тебя, родная, и продлевай судьба твои года, чтобы тепло родительского дома нас согревало долгие года.***

*С уважением и любовью муж, дети, внуки, правнуки.*

❀❀❀

От всей души поздравляю любимую мамочку **Светлану Георгиевну ЦАРУК** с юбилеем!

***Любимая мамочка, от чистой души тебя с Днем рожденья поздравить спешим. Спасибо, родная, за то, что живешь, детей воспитала, внучат бережешь. Желаем радости и счастья, здоровья крепкого вдвойне, желаем самого простого – прожить подольше на земле.***

*Мама, дочери и зятья, сын и внуки.*

❀❀❀

От всей души поздравляю любимую жену **Светлану Георгиевну ЦАРУК** с юбилеем!

***Супруга дорогая, любимая моя, всем сердцем поздравляю я с праздником тебя! Возьми цветов букетик, за все меня прости. Ты лучше всех на свете, ты – ангел во плоти! Ты – солнце в небе синем, ты – песня соловья, я без тебя бессилен, ты - жизнь, судьба моя.***

*Муж.*

❀❀❀

Коллектив УКСП "Бродница" поздравляет главного агронома **Петра Моисеевича СТАСЕВИЧА** с юбилеем!

***В день такого юбилея мы Вам желаем от души, чтоб последующие годы по праву были хороши. Чтоб были счастливы, а внуки все удачливы. Здоровья крепкого желаем, побольше светлых, ясных дней, и, если можно, постарайтесь столетний встретить юбилей.***

❀❀❀

От всей души поздравляем дорогую и любимую жену и мамочку **Надежду Алексеевну ПАНАСОВЕЦ** с юбилеем!

***Тебе, родная наша, всего лишь 60. Душа твоя все краше и теплее взгляд. Поэтами воспета, трудилась день и ночь. Всегда была готова ты каждому помочь. И нас ты научила работать и любить, и мы, как ты, стремимся полезны людям быть. Ты отдала нам годы душевного тепла и через все невзгоды всегда вперед вела. Тебе, любимой маме, единственной, родной, шлем поздравленья наши и наш поклон земной.***



*Муж, дети, внучки.*


**ПРОДАЮТСЯ**

**БРУС** (10х275), срочно. Тел. **8-033-699-18-29.**

**РАКОВИНА** новая, **ХОЛОДИЛЬНИК** "Атлант", **УНИТАЗ** с бачком; **ПРИХОЖАЯ** "Топаз", все б/у. Тел.: **2-53-88, 8-029-528-91-04.**

**УГЛ. КУХНЯ** Чехия; **ТАХТА; ШКАФ** 3-дверн; все б/у. Тел. **8-029-826-76-88.**

**КУПЛЮ**

**корову, телку, телят, овец, свиней.** Тел. **8-029-223-36-17, 8-01642-71-2-06.**

ИП ПРОКОПЮК П. П. УНН 290248465

**КУПЛЮ**

**ТЕЛКУ.** Дорого. Тел. **8-033-605-96-43.**

ИП НОВИЦКИЙ А. А. УНН 290041707

**КОРОВУ, КОНЯ.** Дорого. Тел. **8-029-551-88-88.**

ИП БАТОРИН В. С. УНН 290756604

**ЩЕНКИ (дворняжки) в дар.** Тел.: **205-04-55** (МТС), **2-68-94.**

**Доктор Мартыненко С. А.**

из г. Минска **9 и 16 января в 9.30 и 11.30** в Пинском городском Доме культуры проведет лечение от алкогольной и никотиновой зависимости. Тел. в Пинске: **35-52-54, 34-27-66, 8-029-161-77-19.**

Лиц. №02040/0423811 выд. МЗ РБ до 26.05.2014г.


# Служба занятости

**в I квартале 2011 года организует обучение на базе учебных заведений г.Пинска и г.Бреста по профессиям:**

бухгалтерский учет и контроль в промышленности (на базе в/о); вальщик леса; визажист, мастер по маникюру; водитель категории «В,С» (для призывников); водитель категорий «Д», «Е» (под заказ нанимателей); водитель погрузчика; кладовщик (со знанием «1С: Бухгалтерия»); контролер-кассир, оператор ПЭВМ; лифтер; каменщик, бетонщик; маляр, штукатур; облицовщик-плиточник; машинист крана автомобильного; машинист крана (крановщик) (мостового, козлового, башенного); обувщик по ремонту обуви; оператор котельной (газифицированной); оператор ПЭВМ (со знанием «1С: Бухгалтерия»); официант; парикмахер; повар, кондитер; предприниматель; продавец; рамщик; секретарь, делопроизводитель; слесарь по ремонту автомобилей; станочник деревообрабатывающих станков, столяр, плотник, стропальщик; токарь. фрезеровщик; тракторист-машинист сельскохозяйственного производства (кат.«В, D, F»); швея, электрогазосварщик, электромонтер и по многим другим профессиям.

Начало обучения по мере комплектования групп.

Обращаться: **ул.Ленина, 2, каб.№8,** тел. **2-66-69.**


**ФОТОСЪЕМКА СВАДЕБ; ПЕЧАТЬ ФОТОГРАФИЙ; ПЕРЕЗАПИСЬ ВИДЕОКАССЕТ НА DVD-ДИСКИ.**

Тел.: **8-029-223-30-90** (МТС), **8-029-960-73-46** (Vel).

ИП Шелягович А. Г. УНН 290343045

**ИЩУ НЯНЮ.** (возраст 40 лет). Тел. **8-029-782-77-78.**

***Работа для женщин (с 25 лет) в комп.Орифлэйм. Не продажи.***

Тел.: **8-029-782-77-78.**

ИП КУЛИЧ Т. А. УНН590650135

**РЕМОНТ холодильников, морозильников по городу и району. ГАРАНТИЯ.**

Прием заявок по телефонам: **8-029-346-23-21, 728-35-03, 2-60-79.**

Стаж работы по специальности 24 года.

ИП МОРГАВЧУК А. П. УНН 200073934

**КРАСИВЫХ ЗАБАВНЫХ КОТЯТ** отдам заботливым хозяевам. Тел.: **8-029-150-97-19, 45-1-07.**

**АВТОСАЛОН**

**Продаются**

**а/м VW-ДЖЕТТА,** 87 г. в., 1.3Б. Тел. **8-029-794-35-28** (МТС).

**а/м АУДИ-80,** 90 г. в., 1.8і. Тел. **672-77-71** (МТС).

**а/м СЕАТ-АЛЬХАМБРА,** 99 г. в., 1.9ТДІ. Тел. **8-033-605-11-94** (МТС).

**а/м ДЭУ-ЭСПЕРО,** 96 г.в., 1.8і, срочно. Т. **8-033-699-18-29.**

**ЗАКУПАЕМ**

**СВИНИНУ.** Тел.: **2-67-64, 8-029-233-96-39.**

ИП КУЗЬМИЧ Ю. П. УНН 290210310

**СВИНИНУ.** Тел. **8-029-798-12-71.**

ИП МАЛИЧ Е. М. УНН 290820356


## Дзякуй, "Галактыка"!

У нас здарылася гора. Ад яго, на жаль, ніхто не застрахаваны. Памёр тата Барыс Мікалаевіч Пахолка. Бясспрэчна, пасля цяжкай працэдуры пахавання нябожчыка памінаюць за скаромнай вячэрай. Памінальны стол мы накрывалі ў кафэ "Брава" і вельмі задаволены абслугоўваннем. А вось саракавыя памінкі адбыліся ў гарадскім кафэ "Галактыка". Прызнаюся, не чакала, што і там усё будзе так тактоўна, паважліва, далікатна. Шчыра дзякую я і мая мама Вольга Сцяпанаўна Пахолка, повару кафэ "Галактыка" Яўгеніі Іванаўне Цыбук, буфетчыцы Але Фёдараўне Гарбачык, прыбіральшчыцы Ніне АляксандраўнеМірчук. Яны сапраўдныя прафесіяналы і добрыя людзі.

***Галіна ПАХОЛКА, г. Іванава.***

Коллектив ГУО "Юхновичская средняя общеобразовательная школа" выражает глубокие соболезнования Бойко Светлане Григорьевне в связи с постигшим ее горем - смертью **СЕСТРЫ Галины.**

Правление, профком СПК "Дружиловичи" выражают глубокие соболезнования Михалик Жанне Михайловне и Михалику Виктору Васильевичу по случаю постигшего их горя - смерти **СЕСТРЫ и СВОЯЧЕНИЦЫ.**

Дирекция, профком УКСП "Бродница" скорбят по случаю смерти пенсионера **КАЗЮКИНА Михаила Алексеевича** и выражают глубокие соболезнования его родным и близким.

Дирекция, профком УКСП "Бродница" скорбят по случаю смерти пенсионера **ЛИСИЦКА Андрея Никифоровича** и выражают глубокие соболезнования его родным и близким.

Дирекция, профком УКСП "Бродница" скорбят по случаю смерти пенсионера **ЧАПЛЮКА Сергея Артемовича** и выражают глубокие соболезнования его родным и близким.

Ивановский районный исполнительный комитет и Ивановский районный Совет депутатов выражают искренние соболезнования председателю сельскохозяйственного производственного кооператива "Агро-Мотоль" Каштальяну Вячеславу Николаевичу в связи с постигшим его горем - смертью **МАТЕРИ** и разделяют его горе и боль утраты дорогого человека.

Правление и профком СПК "Агро-Мотоль" выражают глубокие соболезнования Каштальяну Вячеславу Николаевичу и Каштальян Марии Григорьевне по случаю постигшего их горя - смерти **МАТЕРИ и СВЕКРОВИ.**

Ивановский райком профсоюза работников АПК и коллегия управления сельского хозяйства райисполкома выражают глубокие соболезнования Вячеславу Николаевичу Каштальяну в связи с постигшим его горем - смертью **МАТЕРИ.**

Коллектив Мотольского сельисполкома выражает глубокие соболезнования Вячеславу Николаевичу Каштальяну в связи с постигшим его горем - смертью **МАТЕРИ.**

Районный совет ветеранов глубоко скорбит по случаю смерти ветерана труда, члена президиума районного совета ветеранов, человека активной жизненной позиции **КУЗЬМЕНОК Нины Казимировны** и выражает соболезнования родным и близким покойной.

Пусть наши слова сочувствия облегчат боль родных от потери дорогого человека.

Правление СПК "Горбаха-Агро" выражает глубокое соболезнование Кунаховцу Леониду Ивановичу в связи с постигшим его горем - смертью **ОТЦА.**

Коллектив работников ГУО "Крытышинская средняя общеобразовательная школа" выражает искреннее соболезнования Рудницкой Валентине Михайловне и ее семье в связи с постигшим их горем - смертью **МУЖА и ОТЦА.**

Коллектив работников ГУО "Средняя общеобразовательная школа № 2 г. Иваново" выражает искренние соболезнования главному специалисту отдела образования Рудницкой Валентине Михайловне и ее семье в связи с постигшим их горем - смертью **МУЖА и ОТЦА.**

Коллектив Ивановского РУПС выражает глубокое соболезнование почтальону ОПС Бродница Трепачко Ирине Сергеевне по случаю постигшего ее горя - смерти **ОТЦА.**

Кафедра учителей математики ГУО "Средняя общеобразовательная школа № 2 г. Иваново" выражает искренние соболезнования Катеринич Валентине Васильевне и ее семье в связи с постигшим их большим горем - смертью **СЕСТРЫ и ТЕТИ.**

Коллектив Ивановского РУПС выражает глубокое соболезнование начальнику ОПС Псыщево Мазур Елене Збигневне по случаю постигшего ее горя - смерти **ОТЦА.**


Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь

Установа "Рэдакцыя газеты "Чырвоная звязда" і праграмы радыёвяшчання "Гаворыць Іванава"

**ЗАСНАВАЛЬНІКІ:** Іванаўскі раённы выканаўчы камітэт і раённы Савет дэпутатаў

**Выходзіць па аўторках і пятніцах, на беларускай і рускай мовах.**

Рэгістрацыйны № 812

**Адрас рэдакцыі: 225800, г. Іванава, Савецкая, 91**

Падпісана да друку ў 9.00.

Заказ №1

**Тыраж 7000**

**Індэкс індывідуальнай падпіскі 63951, ведамаснай - 64148.**

***Галоўны рэдактар Анатоль Мікалаевіч КРЭЙДЗІЧ***

Газета набрана на рэдакцыйнай камп'ютэрнай настольна-выдавецкай сістэме, аддрукавана афсетным спосабам з арыгінал-макета рэдакцыі ў Пінскай рэгіянальнай друкарні галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы Брэсцкага аблвыканкама: 225710, г. Пінск, вул. Леніна, 42. Аб'ём - 1 друкаваны аркуш. Фармат 600х420 мм.

**ТЭЛЕФОНЫ:**

| | |
|---|---|
| галоўнага рэдактара | 2-12-63 |
| адказнага сакратара | 2-20-01 |
| загадчыка аддзела аграрнай палітыкі | 2-15-02 |
| загадчыка аддзела пісьмаў | 2-12-36 |
| аператараў | 2-15-38 |
| бухгалтара | 2-16-46 |
| раённага радыё | 2-14-03 |

**Аддзел рэкламы - 2-15-02**

АДРАС ЭЛЕКТРОННАЙ ПОШТЫ: **zviazda@brest.by** САЙТ: **WWW.JANOW.BY**

**Пункт гледжання аўтараў апублікаваных матэрыялаў можа не супадаць з пунктам гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць прыведзеных фактаў. За дакладнасць рэкламы нясе адказнасць рэкламадаўца.**

ISSN 2075-8006